○ ГРОДЗЕНШЧЫНА

# «ЗА РЭФОРМЫ, АЛЕ МІРНЫМ ШЛЯХАМ»

**Путрышкі — адна з найбліжэйшых да абласнога цэнтра вёсак. Ад Гродна — усяго кіламетраў пяць-шэсць. Такая блізкасць дае магчымасць многім жыхарам вучыцца і працаваць у Гродне. У іх ліку Таццяна Сямёнава, якая прыйшла на выбарчы ўчастак адна з першых. Жанчына доўгі час працавала на прадпрыемстве «Гродна Азот», цяпер на заслужаным адпачынку, займаецца хатняй гаспадаркай. Для яе галоўная каштоўнасць — гэта мір. Яна лічыць, што рэформы павінны адбывацца, але мірным шляхам.**



Сям'я Юнцэвічаў прыйшла на ўчастак у поўным складзе. Яўген галасуе ўпершыню. Ён студэнт ГрГУ, летам займаецца падпрацоўкай. Спяшаліся на работу і бацькі. Ва ўсіх настрой з ранку бадзёры. Па словах маці, кожны самастойна вызначаўся, за каго аддаць свой голас на выбарах. Сама Ірына жадае сваім дзецям светлай будучыні, мірнага неба над галавой, каб не было ніякіх ваенных дзеянняў. Сын Яўген таксама з гэтым згодны. Яму як выбаршчыку, які прыйшоў на ўчастак упершыню, уручаныя памятны ліст і падарунак. Цікава, што Яўген галасуе на ўчастку, які называецца Маладзёжны.

**Старшыня выбарчай камісіі Ірына ТОЎКАЧ** расказала, што з 880 выбаршчыкаў 388 прагаласавалі датэрмінова. Паралельна праходзяць выезды членаў камісіі на дом. Ужо ахоплена больш за 100 чалавек. Выезды ажыццяўляюцца па меры паступлення зваротаў.

Упершыню галасуе і сын Наталлі і Вадзіма Яремічаў на суседнім участку № 30. Бацькі сказалі, што ён будзе пазней, затое прыйшлі з малодшай дачкой і пазітыўным настроем. Выбар рабілі разам, пры гэтым абмеркавалі кожнага кандыдата. Галасы вырашылі аддаць за стабільнасць і парадак. Наталля лічыць важнай для сваіх дзяцей магчымасць рэалізаваць сябе, працаваць і зябяспечваць сваю сям'ю, як гэта зрабіла яна з мужам. Сама Наталля працуе ў мясцовай гаспадарцы інжынерам-заатэхнікам. Тут сям'я атрымала жыллё як шматдзетная. А ў дзяцей ёсць магчымасць наведваць спартыўныя школы ў абласным цэнтры.

Жыхарка вёскі Жытомля Ірына Шляга прыйшла на свой выбарчы ўчастак № 8 таксама з ранку. Яна расказала, што асаблівых сумненняў, за каго галасаваць, не мела. Кандыдат, якому яна аддала свой голас, разумее народ, у тым ліку і вясковых жыхароў. «Гэта вельмі складаная і адказная работа, — заўважыла Ірына. — Гэта трэба разумець і нашай моладзі. Калі маладыя людзі не могуць самі зрабіць выбар, то вядуцца на розныя заклікі і абяцанні». Цяпер вёска прыкметна аднавілася, людзі тут жывуць ветлівыя і добразычлівыя, кажа суразмоўніца. Вядома, працэс старэння насельніцтва не мінае населены пункт, але гэта прыкмета часу. Між тым моладзь таксама прыходзіць працаваць у гаспадарку. Ірына сама доўгі час была супрацоўніцай моцнага сельскагаспадарчага кааператыва «Прагрэс-Верцялішкі». Яна лічыць, што ўсё прыходзіць з часам, трэба толькі жыць па сродках.

На выбарчым участку даволі высокая яўка. Амаль палова выбаршчыкаў галасавала датэрмінова. Гэта абумоўлена ходам сельскагаспадарчых работ, растлумачыла **старшыня Жытамлянскага ўчастка № 8 Людміла ЧЫЖЫК.** Кожны прыходзіў у вольны ад работы час.

Станіслава Лебядзевіч узяла на ўчастак трох унукаў. Менавіта ў гэты дзень яе сям'я сабралася разам. З кандыдатам Станіслава вызначылася даўно. Яна працуе на ферме чвэрць стагоддзя і бачыць, як мяняюцца ўмовы працы і аплата. Ад гаспадаркі атрымалі кватэру, прыватызавалі. І сын, і дачка таксама засталіся працаваць у сельгаскааператыве. «Дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся», — лічыць Станіслава.

Пасля працэдуры галасавання жанчына павяла сваіх унукаў у буфет, каб выбралі сабе пачастункі. На кожным участку у праграме — канцэрт на адкрытай пляцоўцы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Мікалая ЛАПІНА.**

○ ВІЦЕБШЧЫНА

# «Мы ведаем цану міру»

**Па традыцыі старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ прагаласаваў у Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, дзе калісьці вучыўся.**

Сёлета, як заўсёды падчас выбараў, губернатар прыйшоў на ўчастак каля васьмі гадзін раніцы, якраз да адкрыцця. Але прагаласаваў не першы. Да яго свой выбар упершыню ў жыцці зрабіла студэнтка трэцяга курса акадэміі Ангеліна Семянкевіч. Дзяўчына нават разгубілася, калі журналісты літаральна занялі чаргу, каб пагутарыць з ёй. У яе аднакурсніцы Аляксандры Дубінкі таксама было шмат інтэрв'ю ды хваляванняў.

Кіраўнік выканаўчай улады Прыдзвінскага краю павіншаваў студэнтак са значнай падзеяй у іх жыцці. Пацікавіўся, чым захапляюцца, спытаў: можа чагосьці не хапае, каб з карысцю для інтэлекту і здароўя бавіць час? Агучыў прыклады, калі іх равеснікі з'язджалі за акіян «па ўдачу», але вярталіся на Радзіму, і ўпэўніваліся, што тут можна праявіць сябе і дзякуючы ведам, працаздольнасці, прафесійнаму росту дабіцца многага.

Каментуючы ход выбараў у Віцебскай вобласці, Мікалай Шарснёў падкрэсліў, што галоўнае — мірная палітыка. Мы ведаем цану міру і не хацелі б, каб выбухалі снарады, свісталі кулі. А што да ўзроўню жыцця — тут многае залежыць ад нас, падкрэсліў губернатар. І выказаў надзею на тое, што землякі зробяць правільны выбар.

Былі тут і назіральнікі ад місіі СНД. Адзін з іх — Аляксандр Серавін, які займаецца навуковай дзейнасцю ў галіне паліталогіі. Ён — кіраўнік лабараторыі электроннай электаральнай палітыкі ЛДУ імя А. Пушкіна. Сказаў, што «ўзяў на аловак» наступнае: у нас людзям з праблемамі зроку даецца магчымасць атрымаць максімум інфармацыі для выбаршчыка. Такога ў Расіі няма. Таксама ўразілі чысціня і прыгажосць Віцебска.

У часовым буфеце ўчастка, як і заўсёды падчас такіх мерапрыемстваў, арганізавалі багаты выбар прадукцыі: ад шашлыкоў да пірагоў. Цэны парадавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

○ БРЭСТЧЫНА

# «Усё спакойна, ніякіх заўваг»

**На выбарчым участку № 17 у вёсцы Воўчын Камянецкага раёна зарэгістраваны 382 выбаршчыкі з шасці вёсак. Участак размешчаны ў будынку сельскага Савета. Зранку тут гучыць музыка. Пакрысе падыходзяць людзі.**

— Найбольшая актыўнасць была з васьмі гадзін, — кажа **старшыня камісіі Ігар ДУЛЬКО.** — Вясковыя людзі ўстаюць рана: прагаласаваў і пайшоў-паехаў па справах. А тыя, хто ў выхадны дзень нікуды не спяшаецца, ідуць пазней.

Ігар Дулько першы раз працуе ў якасці старшыні выбарчай камісіі, таму крыху хвалюецца, хоць усё ідзе тут сваім парадкам. Участак да выбараў падрыхтаваны, аснашчаны сродкамі абароны ад інфекцый. Члены камісіі нагадваюць наведвальнікам пра магчымасць выкарыстання антысептыкаў. Самі працуюць у масках і па жаданні выбаршчыкаў выдаюць маскі ім. Скрыня для бюлетэняў празрыстая. На ўчастку дзяжураць супрацоўнік МНС, міліцыянер, медсястра з амбулаторыі. Старшыня камісіі паведаміў, што датэрмінова прагаласавалі 185 чалавек. 16 грамадзян пакінулі заяўкі аб галасаванні па месцы жыхарства.

Амаль насупраць сельвыканкама размешчаны храм. І як толькі звон апавяшчае завяршэнне службы, актыўнасць выбаршчыкаў узрастае. На ўчастак заходзяць жанчыны ў белых хусцінках. Яно і зразумела: спачатку сілкаванне для душы, а потым — грамадзянскі абавязак. Як самага жаданага госця сустракаюць на ўчастку 92-гадовую Ганну Лявоненка. Ганна Іванаўна — былая настаўніца. Многія з тых, хто працуюць у гэтым будынку, а таксама ў камісіі, — яе вучні.

Ганна Іванаўна расказала, што прыехала сюды за мужам, ветэранам вайны, які шмат гадоў быў дырэктарам школы ў Воўчыне. А сама яна 42 гады адпрацавала на ніве адукацыі. Выкладала, дарэчы, гісторыю і грамадазнаўства. Вось цяпер на прыкладзе работы камісіі можа ўпэўніцца ў якасці і трываласці ведаў, якія дала вучням.

Згадала Ганна Іванаўна, што ў свой час і сама не раз працавала ў камісіях па выбарах розных узроўняў, была і старшынёй камісіі. Пасля галасавання ветэран працы зазірнула ў кабінет да старшыні сельскага Савета Віктара Палешчука, свайго вучня. Віктар Пятровіч пазней паведаміў карэспандэнту, што Ганна Лявоненка — чалавек актыўнай грамадзянскай пазіцыі, шмат робіць для выхавання маладога пакалення.

Пакуль гаварылі з Ганнай Іванаўнай, якую суправаджала дачка, падышоў маладжавы пенсіянер Уладзімір Лук'яненка. Сказаў, што на выбары з даўніх часоў ходзіць галасаваць у асноўны дзень, а галасуе, вядома, за спакойную будучыню Беларусі, за мір, дабрабыт, росквіт.




На здымку: 92-гадовая Ганна ЛЯВОНЕНКА.

На сельскім выбарчым участку працуюць назіральнікі. Вольга Жыранок, вылучаная назіральнікам ад раённай арганізацыі прафсаюза аграпрамысловага комплексу, падзялілася сваімі ўражаннямі:

— Назіраю не першы дзень за працэсам галасавання, ніякіх заўваг да камісіі не магу выказаць. Усё праходзіць спакойна, па-дзелавому, у рамках закону.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Камянецкі раён.*